5. Кодекс Республики Беларусь об образовании : 13 янв.2011 г., № 243-З : принят Палатой представителей 2 дек.2010 г. : одобр. Советом Респ. 22 дек. 2010 г. – Минск : Амалфея, 2011. – 496 с.

6. Концепция развития инклюзивного образования лиц с особенностями психофизического развития в Республике Беларусь [Электронный ресурс] : утв. Приказом М-ва образования Респ. Беларусь № 608 от 22 июля 2015 г. – Режим доступа: www.asabliva.by /sm.aspx?guid=91763. – Дата доступа : 25.09.2017.

7. Об утверждении Государственной программы «Образование и молодежная политика» на 2016–2020 годы [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь от 28.03.2016. – Редим доступа: http://www. government.by/ru/solutions/2450. – Дата доступа : 25.09.2017.

8. Данилова, Е. В. Инклюзивное образование как долгосрочная стратегия [Электронный ресурс] / Е.В. Данилова // Соцполитика : информ.-аналит. портал. – 2007. – Режим доступа : http://socpolitika.ru/rus/conferences/3985/3986/ 3988/ document4065.shtml. – Дата доступа : 22.05.2017.

9. Инклюзивное образование / сост. : С.В. Алехина, Н.Я. Семаго, А.К. Фадина. – М. : Шк. кн., 2010. – Вып. 1. – 272 с.

10. Гончарова, Е.Л. Термин «ребенок с особыми образовательными потребностями» в контексте отечественной научной школы дефектологии Е.Л. Гончарова, О.И. Кукушкина // Специальное образование : состояние, перспективы развития : темат. прил. к журн. «Вестник образования». – 2003. – № 3. – С. 72 – 82.

**М.Р. ГАРБАЧЫК**
Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## ВЫКАРЫСТАННЕ ІНАВАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ ЯК АДЗІН СА СПОСАБАЎ ПАВЫШЭННЯ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ У ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Аб’ектыўнай неабходнасцю ва ўмовах сучаснай адукацыі становіцца засваенне настаўнікам і выкарыстання ім на сваіх уроках інавацыйных тэхналогій пры навучанні вучняў. Асноўная мэта навучання – гэта не толькі назапашванне вучнем пэўнай сумы ведаў, уменняў, навыкаў, але і падрыхтоўка школьніка як самастойнага суб’екта навучальнай дзейнасці. У аснове сучаснай адукацыі ляжыць актыўнасць вучня, якую накіроўвае настаўнік. Менавіта гэтай мэце – выхаванню творчай, актыўнай асобы, якая ўмее вучыцца, удасканальвацца самастойна, і пападрадкоўваюцца асноўныя задачы сучаснай адукацыі.

Інавацыйная педагагічная (адукацыйная) тэхналогія разглядаецца як навукова-прыкладная дзейнасць, што задае стратэгію рэалізацыі глабальных мэт адукацыі, праектаванне ідэальнай тэарэтычнай мадэлі тэхналагізацыі адукацыі, гэта сістэма функцыянавання ўсіх кампанентаў педагагічнага працэсу, якая пабудавана на навуковай аснове, запраграмавана ў часе і ў прасторы. Тэхналогія навучання ставіць сваёй мэтай праектаванне мадэлі тэхналагізацыі канкрэтнага адукацыйнага працэсу ў межах асобнай дысцыпліны, г. зн. задае тактыку рэа-

лізацыі стратэгіі задач адукацыі. Для вырашэння канкрэтызаваных дыдактычных задач і праектуецца пэўная тэхналогія навучання. Усе тэхналогіі арыентваны на практыку навучання і выхавання. Інавацыйнае навучанне – гэта фундаментальнасць адукацыі, творчы пачатак, прафесіяналізм, выкарыстанне самых новых тэхналогій. Актуальнасць іх заключаецца ў выкарыстанні асобасна-арыентаванага навучання, а таксама ў пошуку ўмоў для раскрыцця творчага патэнцыялу вучня. Асноўнымі мэтамі інавацыйнага навучання на ўроках беларускай мовы з'яўляюцца:

1) развіццё інтэлектуальных, камунікатыўных, лінгвістычных і творчых здольнасцей вучняў;

2) фарміраванне асобасных якасцей вучняў;

3) выпрацоўка ўменняў, якія ўплываюць на вучэбна-пазнавальную дзейнасць і пераход на ўзровень прадуктыўнай творчасці;

4) фарміраванне ключавых кампетэнтнасцей вучняў.

Гэтымі мэтамі вызначаюцца і задачы інавацыйнага навучання: аптымізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу; стварэнне абставін супрацоўніцтва вучня і настаўніка; выпрацоўка доўгачасовай станоўчай матывацыі да навучання; скрупулёзны адбор матэрыялу і спосабаў яго падачы. У аснове інавацыйнага навучання ляжаць наступныя тэхналогіі: развіццёвае навучанне; праблемнае навучанне; развіццё крытычнага мыслення; тэхналогія "Метад праектаў"; дыферэнцыраваны падыход да навучання; 6) стварэнне сітуацыі поспеху на ўроку; інфармацыйныя тэхналогіі.

Выкарыстанне названых тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання мае вялікія перавагі над традыцыйнымі. Адукацыйны працэс становіцца для вучняў цікавым, павышаецца актыўнасць вучняў на ўроках, развіваюцца навыкі самастойна атрымлівання ведаў у працэсе ўзаемадзеяння і пошуку, павышаецца якасць і трываласць атрыманых ведаў, развіваюцца даследчыцкія навыкі і ўменні, фарміруюцца аналітычныя здольнасці вучняў. Паралельна з працэсам навучання ідзе развіццё камунікатыўных якасцей і фарміраванне лідарскіх якасцей вучняў. Пры выкарыстанні інавацыйных тэхналогій у навучанні беларускай мове і літаратурнаму чытанню мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя прыёмы: асацыятыўны рад, апорны канспект, групавая дыскусія, сінквейн, эсэ, ключавыя тэрміны, пераблытаныя лагічныя ланцужкі, дыдактычныя гульні, лінгвістычныя карты, лінгвістычныя задачы, даследаванне тэксту, праца з тэкстам, заданні пошукавага характару, нетрадыцыйныя формы дамашняга задання і інш.

Адной з задач сучаснага ўрока з'яўляецца пошук такіх формаў узаемадзеяння настаўніка і вучня на ўроку, калі суб'ектыўная пазіцыя вучня рэалізуецца максімальна. Вучням цікава дзейнічаць, актыўна ўдзельнічаць у ходзе ўрока, памыляцца і шукаць прычыны памылак, фармуляваць пытанні, а не толькі адказваць на іх, г. зн., ім хочацца на ўроку займаць актыўную камунікатыўную пазіцыю. Задача настаўніка – дапамагчы вучню ўбачыць яго ролю на ўроку, перавесці вучэбную дзейнасць школьніка ў творчае рэчышча. Выкарыстанне інавацый-

ных тэхналогій на розных этапах урока дапаможа зрабіць яго эфектыўным, выніковым, а працэс атрымання ведаў для вучняў – цікавым і прадуктыўным.

Такім чынам, толькі пералік некалькіх тыпаў тэхналоггій навучання і раскрыццё іх сутнасці дазваляе выявіць накірункі і спосабы арганізацыі навучальнай дзейнасці вучняў з мэтай развіцця іх самастойнасці, творчасці, цікавасці да авалодання новым матэрыялам, новымі ведамі.

**М.Р. ГАРБАЧЫК**
Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## ФАРМІРАВАННЕ МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНЫХ І ЭСТЭТЫЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Пытанні маральна-этычнага і эстэтычнага выхавання чалавека заўсёды хвалявалі грамадства. Асабліва гэта актуальна ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, калі назіраецца зніжэнне маральна-этычнай і эстэтычнай культуры. Таму задача фарміравання маральна-этычных і эстэтычных якасцей падрастаючага пакалення на сучасным этапе набывае вялікую актуальнасць. У XXI стагоддзі назіраюцца змены ў парадыгме навучання і выхавання, што абумоўлена тымі працэсамі, якія адбыліся і адбываюцца ў сучасным грамадстве. Перад сям'ёй, школай ставіцца задача падрыхтоўкі будучага члена грамадства з высокім узроўнем маральна-этычнай і эстэтычнай культуры. Літаратура – адзін з віда мастацтва, які ўздзейнічае на чытача маральна, этычна і эстэтычна. Развіццё маральна-этычнай і эстэтычнай культуры вучняў (фарміраванне іх маральна-этычных уяўленняў, маральнага аблічча, станаўленне каштоўнасных арыенціраў, фарміраванне густу і г.д.) уяўляе сабой працяглы і складаны працэс, які немагчыма ўявіць без удзелу ў ім літаратуры. Вялікую ролю ў гэтым займае дзейнасць настаўніка, яго ўзаемадзеянне з вучнямі малодшага школьнага ўзросту на ўроках літаратурнага чытання, паколькі менавіта гэты ўзрост характэрызуецца павышанай успрымальнасцю да засваення адпаведных правілаў, нормаў культуры паводзін. Вучань аналізуе сітуацыю, прачытаную ў той ці іншай кнізе, робіць пэўныя высновы аб учынках героя, пераносяць іх на сябе за кошт развіцця ўяўлення.

Звычайна ў педагагічнай літаратуры пытанні выхавання школьнікаў даследуюцца ў сувязі з пазакласнай і пазашкольнай працай, якая праводзіцца настаўнікам, патэнцыял урока выкарыстоўваецца недастаткова. Аднак відавочна, што фарміраванне не проста навыку чытання, а навыку выбарачнага чытання, роздуму і аналізу прачытанага тэксту, з'яўляецца больш прыярытэтнай задачай, так як гэта дазволіць сфарміраваць у вучняў маральна-этычныя і эстэтычныя якасці асобы, развівацца ім духоўна.

Можна вылучыць некалькі асноўных напрамкаў рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу ўрока літаратурнага чытання: а) выхаваўчы патэнцыял твора, які